**УДК 7.036:75:[378+377]:94(476.5-25)"1904/1964"**

# Захавальнік рэалістычных традыцый школы: да 120-годдзя Валянціна Дзежыца

***Цыбульскі М.Л.***
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск*

*Артыкул прысвечаны жыццю і творчасці Валянціна Дзежыца (09.03.1904 – 29.12.1964) – яркага прадстаўніка Віцебскай мастацкай школы XX стагоддзя, мастака, члена Саюза мастакоў СССР і члена Саюза мастакоў БССР, першага загадчыка кафедры малюнка і жывапісу мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава. У даследаванні апавядаецца пра пераемнасць мастацкіх традыцый Віцебскай школы і ролю Дзежыца як фігуры, што звязвае даваенны і пасляваенны этапы яе гісторыі. У кантэксце гісторыі школы апісваецца яго педагагічная і творчая дзейнасць.*

*Аўтар разглядае вучобу В. Дзежыца ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме, Вышэйшым мастацка-тэхнічным інстытуце ў Ленінградзе, аналізуе ўплывы розных педагогаў на яго творчасць. Асобны раздзел прысвечаны працы Дзежыца ў Беларускім мастацкім тэхнікуме (з 1934 года рэарганізаваным у Віцебскае мастацкае вучылішча), Віцебскім педагагічным вучылішчы, Віцебскім мастацка-графічным педагагічным вучылішчы і на мастацка-графічным факультэце Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута.*

*Прадстаўлены найбольш важныя жывапісныя творы мастака, якія дазваляюць казаць аб зацвярджэнні ў яго творчасці гарадскога пейзажа ў якасці аднаго з вядучых жанраў, асаблівасці якога знаходзяцца на мяжы пейзажа і сюжэтнай карціны.*

*Асноўнымі крыніцамі інфармацыі пра жыццё, выкладчыцкую дзейнасць і творчасць В. Дзежыца сталі архіўныя матэрыялы, артыкулы і публікацыі, напісаныя пра мастака сучаснікамі, каталогі выставак, а таксама шматлікія гутаркі з яго сябрамі, калегамі і былымі студэнтамі розных навучальных устаноў, дзе ён выкладаў.*

***Ключавыя словы:*** *Валянцін Дзежыц, жывапіс 1930-х – пачатку 1960-х гадоў, пейзаж, тэматычная кампазіцыя, Беларускі мастацкі тэхнікум, Віцебскае мастацка-графічнае педагагічнае вучылішча, мастацка-графічны факультэт, Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут.*

*(Искусство и культура. – 2024. – № 1(53). – С. 5–11)*

# Keeper of Realistic Traditions of the School: to the 120th Anniversary of Valyantyn Dzezhits

***Tsybulsky M.L.***
*Education Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University", Vitebsk*

*The article is devoted to the life and creativity of Valentin Dzezhits (March 9, 1904 – December 29, 1964) – a bright representative of the Vitebsk Art School of the 20th century, an artist, a member of the Artist Union of the USSR and a member of the Artist Union of of the BSSR, the first Head of the Department of Drawing and Painting on Art and Graphic Faculty of Vitebsk Pedagogical Institute named after S.M. Kirov. The article tells about the continuity of artistic traditions of the Vitebsk School and the role of Dzezhits, as a figure connecting the pre-war and post-war stages of its history. In the context of the history of the school, his pedagogical and creative activities are considered.*

*The author examines the studies of V. Dzezhits at the Vitebsk Art College , the Higher Art and Technical Institute in Leningrad, analyzes the influence of various teachers on his creativity. A separate section is devoted to the work of Dzezhits in the Belarusian*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: mtsybulsky@rambler.ru – М.Л. Цыбульскі*

*Art Technical College (since 1934 reorganized into Vitebsk Art School), Vitebsk Pedagogical School, Vitebsk Art and Graphic Pedagogical School and at the Faculty of Art and Graphics in the Vitebsk Pedagogical Institute.*

*The most important paintings of the artist are presented, which allow us to talk about the popularity of the urban landscape in his work as one of the leading genres, the features of which are on the border between a landscape and a story picture.*

*Archival materials, articles and publications written about the artist by his contemporaries, exhibition catalogs, as well as numerous conversations with his friends, colleagues and former students of various educational institutions where he taught became the main sources of information about the life, teaching activity and work of V. Dzezhits.*

***Key words:*** *Valyantsin Dzezhits, painting 1930 – early 1960s, landscape, thematic composition, Belarusian Art Technical College, Vitebsk Art College, Vitebsk Art and Graphic Pedagogical School, Faculty of Art and Graphics, Vitebsk State Pedagogical Institute.*

*(Art and Cultur. – 2024. – № 1(53). – P. 5–11)*

Сёння ўжо не патрабуе навуковага абгрунтавання той факт, што ў гісторыі развіцця Віцебскай мастацкай школы ХХ стагоддзя існавала два напрамкі. Адзін з іх быў звязаны з дзейнасцю шэрага навучальных устаноў, у першую чаргу Віцебскай народнай мастацкай вучэльні (да 1923 года), і творчасцю прадстаўнікоў авангарда першай чвэрці стагоддзя, другі – з працай мастацкага тэхнікума, мастацка-графічнага педагагічнага вучылішча і мастацка-графічнага факультэта ВДПІ (ВДУ), а таксама мастацтвам, арыентаваным на рэалістычныя традыцыі. Пра пераемнасць мастацкіх традыцый Віцебскай школы і ролю Дзежыца як фігуры, што звязвае даваенны і пасляваенны этапы яе гісторыі, напэўна, упершыню напісаў А. Лісаў: “Дзежыц уяўляецца ледзь не адзіным з мастакоў, якія працавалі ў Віцебску ў перадваенныя гады ў мастацкім тэхнікуме і вучылішчы, а пазней вярнуліся ў горад пасля вайны” [1]. Вядомы мастацтвазнавец цалкам справядліва адзначае, што пра Дзежыца ўжо пісалі, аднак ні творчая, ні педагагічная яго дзейнасць у кантэксце гісторыі школы належнай адзнакі пакуль не атрымалі.

Мэта дадзенага артыкула – прааналізаваць творчую і педагагічную дзейнасць В. Дзежыца ў кантэксце розных этапаў развіцця Віцебскай мастацкай школы, выявіць ролю рэалістычных традыцый у яго творчасці і методыцы выкладання.

Асноўнымі крыніцамі інфармацыі пра жыццё, выкладчыцкую дзейнасць і творчасць В. Дзежыца сталі архіўныя матэрыялы, а таксама шматлікія гутаркі з сябрамі, калегамі і былымі студэнтамі розных навучальных устаноў (мастацкага тэхнікума, мастацка-графічнага педагагічнага вучылішча, мастацка-графічнага факультэта ВДПІ), дзе ён выкладаў: З. Азгурам, А. Бембелем, Г. Бржазоўскім, У. Козіным, А. Каржанеўскім, У. Кухаравым, І. Сталяровым, Я. Ціхановічам, В. Цвіркам, А. Філіпавым, М. Чурабам, П. Явічам, В. Вінаградавым, С. Далматавым, В. Шаталавым, Л. Дукальскай, Л. Анцімонавым, В. Сарокіным, Г. Шутавым, Г. Лебедзевым, А. Ільіновым, М. Апіёкам, А. Жукавай, В. Ціханенкам, С. Сянько.

**Валянцін Дзежыц і Віцебск.** Нягледзячы на тое, што фактам свайго нараджэння В. Дзежыц не быў звязаны з Віцебскам, менавіта гэты горад адыграў выключную ролю ў яго жыцці. Уся біяграфія мастака – гэта этапы яго расставання і вяртання ў горад над Дзвіной. У творчасці Дзежыца вобраз Віцебска стаў цэнтральным і нават у пэўнай ступені сфарміраваў яго аўтарскую манеру.

“У студзені 1919 года наша сям’я пераехала ў Віцебск, – піша ў сваёй аўтабіяграфіі Валянцін Дзежыц, – да родных (да сям’і сястры маёй маці). З сакавіка 1920-га я стаў працаваць (...) у шпіталі санітарам (...). Быў беспрацоўным на біржы працы (...) працаваў на часовых работах на чыгунцы (чорнарабочым на дарозе і млыне)” [2].

Восенню 1922 года Валянцін Дзежыц паступае ў Віцебскі мастацка-практычны інстытут, а вечарамі займаецца ў вячэрняй школе для дарослых – рабочай школе імя Н.К. Крупскай. Канцэпцыя, пакладзеная ў аснову плана на 1922–1923 навучальны год, уяўляла сабой “своеасаблівае кампраміснае спалучэнне праверанага «старога» і «найноўшых» дасягненняў у выяўленчым мастацтве” [3]. Можна пагадзіцца з тым, што пануючая ў першы год навучання В. Дзежыца сістэма навучання ў інстытуце, якая базіравалася на абстрактна-фармалістычных прынцыпах, не аказала асаблівага ўплыву на фарміраванне яго светапогляду [4, с. 60].

Калі ў 1923 годзе адбылося пераўтварэнне мастацка-практычнага інстытута ў мастацкі тэхнікум, які ўзначаліў М. Керзін, для працы ў ім з Веліжскай народнай мастацкай школы былі запрошаны мастакі, большасць з якіх з’яўляліся выпускнікамі Пецярбургскай акадэміі мастацтваў і паслядоўна працавалі ў рэчышчы рэалістычнага мастацтва. “Пасля праведзеных новым дырэктарам для ўсіх былых студэнтаў інстытута «паверачных выпрабаванняў» і канфлікту, выкліканага пераэкзаменоўкай, у мастацкім тэхнікуме ў пачатку 1923–1924 навучальнага года былі набраныя толькі два курсы. Праз працэдуру «паверачных выпрабаванняў» быў вымушаны прайсці і В. Дзежыц; ён паспяхова вытрымаў іспыт і

быў залічаны на другі курс Віцебскага мастацкага тэхнікума” [3].

З лістапада 1923 г. В. Дзежыц пачынае займацца ў майстэрні В. Волкава, светапогляд і пазіцыя якога ў мастацтве былі адназначна скіраваны на рэалістычныя традыцыі. “Як мастак-практык Волкаў выклікаў у нас, вучняў, асаблівую павагу, – узгадваў З. Азгур. – Папершае, мы бачылі яго творы на выставах, ведалі, што ў Віцебску ён не толькі пісаў пейзажы з відамі Віцебска і Дзвіной, але і працаваў над сюжэтна-тэматычнымі карцінамі...”[1]. Роля першага настаўніка па мастацтве для Дзежыца аказалася вызначальнай, пра што неаднойчы ён сам пазней казаў сваім калегам[2]. “Дзежыц атрымаў у спадчыну ад свайго настаўніка цікавасць да пейзажнага жывапісу і захаваў яе на ўсё жыццё. Пад кіраўніцтвам Волкава ў яго склаліся трывалыя погляды на жывапіс, пачала фарміравацца свая тэматыка, умацоўвалася вера ў рэалістычныя традыцыі [4, с. 61]. Ужо значна пазней, у пачатку 1960-х, прафесар, народны мастак БССР В. Волкаў напіша пра свайго вучня: “В. Дзежыц яшчэ зусім маладым чалавекам у час вучобы ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме (...) выдзяляўся сваімі здольнасцямі ў галіне малюнка і жывапісу (...)” [5]. Пра гэта яскрава сведчаць і алейныя эскізы Дзежыца на тэму “Барыкады”, што былі прадстаўлены на I Усебеларускай мастацкай выставе (1925) разам з іншымі лепшымі работамі студэнтаў БДМТ.

**Вышэйшы мастацка-тэхнічны інстытут у Ленінградзе.** У 1926 годзе Дзежыц паступіў у Вышэйшы мастацка-тэхнічны інстытут у Ленінградзе. Экзамен ён здаў паспяхова і ў ліку сямі чалавек быў прыняты на жывапісны факультэт [6]. Па словах С. Далматава, Дзежыц прызнаваўся, што перыяд яго навучання ў Ленінградзе быў складаным, вышэйшая мастацкая школа перажывала драматычныя змены[3]. Прынятая ў 1925 годзе праграма, складзеная прафесарам К.С. Пятровым-Водкіным, была прыкладам увядзення новай методыкі навучання мастацтву. На першых курсах па жывапісе праводзіліся практыкаванні з чыстымі фарбамі трох асноўных колераў: сіняга, чырвонага і жоўтага, без дадатку да іх бялілаў і змешвання паміж сабою. Для большага выяўлення формы пісалі адным умоўным колерам [7].

Хутчэй за ўсё менавіта на першым курсе ў час падобных заняткаў і адбылася сустрэча Дзежыца з А. Рыловым – мастаком, імя якога пазней ён назаве першым у спісе сваіх педагогаў у Акадэміі мастацтваў. “Мяне прызначылі тады выкладчыкам жывапісу на першым курсе (...), – піша А. Рылоў. Я сам зацікавіўся практыкаваннямі ў трох колерах (...)” [8]. Тым не менш Рылоў здаецца ўжо тады разумеў, што спецыфічная праграма, складзеная арыгінальным і своеасаблівым мастаком, не падыходзіць для агульнаадукацыйнай мастацкай школы [8], а таму ў працы са студэнтамі нярэдка надаваў больш увагі засваенню рэалістычных форм жывапісу.

Пазней Дзежыц адзначаў, што першыя гады вучобы ў прафесара А. Рылова былі самымі цікавымі і карыснымі[4]. “Вялікая ўвага надавалася прафесійнай падрыхтоўцы” [4]. У сваёй шматгадовай выкладчыцкай практыцы Рылоў аддаваў перавагу нефармальным адносінам з вучнямі, любіў пагутарыць пра жывапіс... Дзежыц успамінаў, што на такіх сустрэчах Рылоў шмат апавядаў студэнтам пра свайго настаўніка Куінджы, пра яго карціны... А яшчэ заўжды запрашаў студэнтаў на выставы Таварыства імя Куінджы, старшынёй якога ён быў[5]. Ствараючы пераважна пейзажы-карціны, Рылоў вельмі любіў працаваць на прыродзе. Для такіх вучняў, як Дзежыц, гэта быў выдатны прыклад служэння мастацтву і адданасці пейзажнаму жанру.

Дзежыц у розных дакументах у ліку першых прыгадваў і яшчэ аднаго свайго выкладчыка – К. Пятрова-Водкіна, які не столькі зараджаў энергіяй візуальнай перакадзіроўкі свету, колькі дзяліўся вопытам паслядоўнага пранікнення ў яго сутнасць – “навукай бачыць” [9]. Нягледзячы на тое, што Дзежыцу хутчэй за ўсё не былі блізкія ні пошукі “стылю эпохі”, ні міфапаэтычнае мысленне Пятрова-Водкіна, магія асобы гэтага настаўніка была відавочнай.

“Мне здаецца, – казаў З. Азгур, – што на Дзежыца таксама паўплываў і яго выкладчык А. Караў, які ў сваіх жывапісных работах надаваў асаблівую ўвагу мяккасці жывапісных адносін і лірычным вобразам. Магчыма таму многія вучні Карава не столькі цікавіліся распрацоўкай «вялікіх» тэм, колькі звярнуліся пераважна да пейзажнага жанру”[6]. Сапраўды, імя А. Карава Дзежыц таксама назаве сярод сваіх педагогаў.

Узгадваючы вучобу ў Ленінградзе, Дзежыц адзначаў, што “ён, як напэўна і большасць студэнтаў Акадэміі, адчувалі неабходнасць пошуку новых форм, але былі за рэалізм. Многім падабаліся імпрэсіяністы, французскае мастацтва пачатку XX стагоддзя. Але ідэалам па-ранейшаму заставалася творчасць І.Я. Рэпіна і В.І. Сурыкава, у жанравых кампазіцыях якіх бачылі апору для традыцыйнага рэалістычнага мастацтва”[7]. Невыпадкова ў анкеце на пытанне, чыя творчасць аказала найбольшы

1 З успамінаў З. Азгура. Запіс гутаркі ў 1986 г.
2 Гутарка з С. Далматавым. Запіс 1994 г.
3 Гутарка з С. Далматавым. Запіс 1994 г.
4 Запіс гутаркі з Р. Клікушыным. 1998 г.
5 Запіс гутаркі з А. Філіпавым. 2013 г.
6 З успамінаў З. Азгура. Запіс гутаркі ў 1986 г.
7 Запіс гутаркі з А. Філіпавым. 2013 г.

ўплыў на Вас, Дзежыц адказаў: “у кампазіцыіі я ўражаны і веру толькі Сурыкаву” [10].

Сёння ўжо вядома, што пераважная большасць імёнаў выпускнікоў Акадэміі, маладых мастакоў 1920-х – пачатку 1930-х гадоў не засталася ў гісторыі мастацтва. “Пасля заканчэння інстытута выпускнікі ішлі працаваць у школы, дамы піянераў і адыходзілі ад творчасці” [11]. Магчыма ўжо ў тыя часы і Дзежыц бачыў сябе не вольным мастаком, а педагогам, і таму разумеў ролю акадэмічных ведаў, жывапіснага рамяства ў сваёй будучай прафесіі. Скіраванасці на педагагічную дзейнасць садзейнічала і тое, што акрамя спецыяльных прадметаў у Акадэміі мастацтваў выкладалася методыка мастацкага выхавання ў школе.

**У Беларускім мастацкім тэхнікуме.** У 1930 годзе Дзежыц скончыў Вышэйшы мастацка-тэхнічны інстытут і атрымаў званне мастака-педагога [2]. З 1931 года да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ён выкладаў у Беларускім мастацкім тэхнікуме (з 1934 года рэарганізаваным у Віцебскае мастацкае вучылішча). У гэты час Віцебскі мастацкі тэхнікум становіцца сапраўднай “кузняй” нацыянальных мастацкіх кадраў Беларусі. Тут Дзежыц сустракаецца са сваімі былымі настаўнікамі У. Хрусталёвым, Ф. Фогтам. Працуючы побач з імі, малады педагог вучыцца ў іх педагагічнаму майстэрству, адначасова працуе творча, захапляючыся кампазіцыяй [4].

“У час вучобы здаецца на апошнім курсе тэхнікума ў калідоры я сустрэў невысокага росту, хударлявага чалавека, – узгадваў А. Каржанеўскі. – Гэта, як аказалася, быў новы выкладчык В. Дзежыц”[8]. “Ен з’явіўся ў тэхнікуме прыкладна ў адзін час з Ахрэмчыкам. Пра абодвух студэнты па чутках ведалі, што гэта мастакі-рэалісты з добрай акадэмічнай адукацыяй”[9]. “Студэнты бачылі Дзежыца на некалькіх праглядах вучэбных работ, але ён паводзіў сябе даволі сціпла і рэдка ўдзельнічаў у спрэчках сваіх калег...”[10].

Шмат у чым дзякуючы Івану Ахрэмчыку праца з натуры ў тэхнікуме заваёўвала ўсё большую папулярнасць[11]. Надзейнай апорай у гэтай справе для яго быў Дзежыц, які лічыў натуру асновай творчага працэсу. Невыпадкова і Дзежыц, і Ахрэмчык шмат працавалі ў Віцебску са студэнтамі на пленэры. “Мы часта пісалі з Дзежыцам гарадскія матывы, – адзначаў В. Сарокін, – і мне часам здавалася, что Віцебск ён ведаў не горш за мяне – карэннага яго жыхара”[12]. “Я нярэдка ў горадзе сустракаў Дзежыца, які вяртаўся з эцюдаў, – сведчыў П. Явіч. – Сваімі ўласнымі адносінамі да натурнага жывапісу ён імкнуўся паказаць нам прыклад таго, як трэба адносіцца да мастацтва”[13].

У пачатку 30-х гадоў “творчасць Дзежыца была як бы асноватворнай лініяй у станаўленні і развіцці рэалістычнага мастацтва маладой рэспублікі”[14]. На жаль, немалая частка твораў мастака даваеннага часу загінула. Таму пра іх мастацкія якасці, кампазіцыйную пабудову, малюнак і каларыт можна меркаваць толькі па крытычных матэрыялах, артыкулах у друку, сведчаннях сучаснікаў.

Пасля зацвярджэння сацрэалізму як галоўнага напрамку ў мастацтве найбольшую папулярнасць набывае жанр сюжэтна-тэматычнай карціны. Дзежыц спрабуе сябе ў гэтым жанры і працуе над кампазіцыяй “Сустрэчны” з жыцця дэпо чыгункі. “На 5 Усебеларускай выставе (1932), – успамінаў А. Бембель, – удзельнікам якой я таксама быў, мне запомніліся творы двух маладых віцебскіх выкладчыкаў – І. Ахрэмчыка і В. Дзежыца. Першы паказаў партрэты, другі – тэматычныя кампазіцыі”[15]. На Беларускую выставу ў Мінску ў 1933 годзе Дзежыц прадстаўляе эскіз кампазіцыі “Ротфронт”, а на перасоўную выставу выяўленчага мастацтва БССР – карціны “Дэпо” (1932) і “Падрыхтоўка да дэманстрацыі ў дэпо”. “Як першая, так і другая праца сведчаць аб накіраванасці мастака да фігуратыўнай кампазіцыі, – пісаў у сваім артыкуле П. Даркевіч, што трэба асабліва вітаць” [12].

На вялікай выставе беларускага мастацтва ў Маскве ў 1935 годзе ўдзел прымала не вельмі многа мастакоў. “Але віцебскіх аўтараў, як заўжды было шмат. На гэтай і практычна на ўсіх даваенных выставах у Мінску былі і творы Дзежыца”[16]. Разам з В. Волкавым і іншымі сваімі настаўнікамі, а зараз ужо калегамі, Дзежыц экспануе свае творы ў Мінску на выставе “БССР за 20 год” (1937). А на Усебеларускай выставе (1939–1940) у сталіцы Дзежыц паказвае гарадскія краявіды “Вапнавыя ямы” і “Вуліца”.

Жывапісныя кампазіцыі Дзежыца 1930-х гадоў дазваляюць казаць аб зацвярджэнні ў яго творчасці гарадскога пейзажа ў якасці аднаго з вядучых жанраў, асаблівасці якога знаходзяцца на мяжы пейзажа і сюжэтнай карціны. Нельга не адзначыць, што падобная разнавіднасць жанра пейзажа ў цэлым адыграла важную ролю ў развіцці мастацтва гэтага часу. Увогуле, краявіды як своеасаблівыя “ўцёкі ў прыроду” ў 1920–1930-х і аж да 1960-х гадоў былі адным з найважнейшых

[8] З успамінаў А. Каржанеўскага. Запіс 1983 г.
[9] З успамінаў М. Чураба. Архіў аўтара.
[10] З успамінаў Г. Бржазоўскага. Запіс гутаркі – сакавік 1994 г. Мінск.
[11] Запіс гутаркі з В. Цвіркам. Чэрвень 1984 г.
[12] З успамінаў выпускніка вучылішча 1956 года В. Сарокіна.
[13] З успамінаў П. Явіча. Запіс гутаркі ў красавіку 1994 г.
[14] З характарыстыкі творчай дзейнасці члена Саюза мастакоў СССР В.К. Дзежыца (23 сакавіка 1962 г.).
[15] З успамінаў А. Бембеля. Запіс гутаркі ў 1984 г. На жаль, кампазіцыя “Сустрэчны” загінула ў час вайны.
[16] З успамінаў З. Азгура. Запіс гутаркі ў 1986 г.

напрамкаў "адпадзення ад афіцыёзу" – таго пласта савецкага мастацтва, якое з прычыны сваёй апалітычнасці не прымыкала ні да сацрэалізму, ні да авангарду [13].

**Другі віцебскі перыяд.** Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны мастак вяртаецца ў Віцебск. У сваёй аўтабіяграфіі пра гэта Дзежыц піша каротка: "спісаўся з аддзелам мастацтваў аблвыканкама і прыехаў у Віцебск" [6]. Пачаў працаваць старэйшым інспектарам Дома народнай творчасці па сектары выяўленчага мастацтва. А з 1946 па 1948 год працаваў толькі ў студыі выяўленчага мастацтва пры Доме народнай творчасці.

Нягледзячы на неўладкаванасць і бытавыя праблемы, Дзежыц і ў гэты час займаецца творчасцю. Мастак піша такія карціны, як "Аднаўленне Віцебска" (1946), эскіз кампазіцыі "Апошнія пешаходы" (1946), "Аднаўленне парахода "Енісей" (1947), "Лесапілка (Піларама)" (1947), "На сударамонтным заводзе" (1947), "9 студзеня 1947 г. (Выбары)" (1947), з якімі ўдзельнічае ў некалькіх пасляваенных выставах у Віцебску і Мінску[17].

Са жніўня 1948 года Дзежыц пачынае працаваць выкладчыкам малявання ў Віцебскім педагагічным вучылішчы. "Адначасова з педагагічнай дзейнасцю, – піша Дзежыц, – я творчы работнік, як мастак (...) удзельнічаю сваімі работамі на выставах" [2].

У 1949 годзе Віцебскае педагагічнае вучылішча было рэарганізавана ў Віцебскае мастацка-графічнае педагагічнае вучылішча. Дзежыц прыняў актыўны ўдзел у яго стварэнні і на працягу 10 гадоў выкладаў у ім спецыяльныя дысцыпліны [14]. "Безумоўна жывапіс студэнты любілі найбольш, як і Дзежыца, які яго выкладаў[18]. "Нягледзячы на недахоп фарбаў, пэндзляў, адсутнасць літаратуры па мастацтве, мы з захапленнем спасцігалі прыёмы рэалістычнага мастацтва, – падкрэслівала А. Жукава. – Вялікай падтрымкай было ўсведамленне таго, што нашы выкладчыкі, такія як Дзежыц, Клікушын, актыўна ўдзельнічалі ў мастацкім жыцці горада. Гэта выклікала гонар за нашых педагогаў!"[19].

"На ўсё жыццё запомніўся мне В. Дзежыц – гэты маленькі, шчупленькі, вельмі рухомы ў сінім халаце чалавек, глыбока і бязмежна ўлюбёны ў сваю прафесію жывапісца і сваіх выхаванцаў, – пісаў у сваіх успамінах В. Сарокін. – Прыгадваю, як Валянцін Канстанцінавіч штодня пасля заняткаў выкочваў з вестыбюля вучылішча свой старэнькі маленькі матацыкл і выязджаў на пленэр ці са спінінгам на Дзвіну. Чалавек выключнай дабрыні, эмацыянальны, з вялікім жыццёвым патэнцыялам і багатай творчай фантазіяй. Мы часта праз акно назіралі моманты, калі Валянцін Канстанцінавіч падчас перапынкаў выходзіў у двор вучэльні, клаўся спіной на лужок, падклаўшы пад галаву свае натруджаныя, усе ў фарбе рукі, і падоўгу ўзіраўся ў блакітнае хмарнае неба. Вяртаючыся ў аўдыторыю з захапленнем расказваў нам, якія цікавыя кампазіцыйныя камбінацыі бачыў ён у працэсе руху аблокаў па нябесным акіяне. Я вельмі ўдзячны гэтаму чалавеку, ганаруся тым, што гэта мой першы педагог, дзякуючы якому зразумеў сэнс і сутнасць жывапісу" [14].

Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь М. Апіёк адзначае: "Дзежыц у маім сэрцы пакінуў след на ўсё жыццё. Я яго часта ўзгадваю. Для мяне, хлопца, які прыехаў з вёскі, ён быў першы чалавек, які адкрыў мне СВЕТ ЖЫВАПІСУ. Ён вельмі цёпла і па-сяброўску ставіўся да нас – студэнтаў. Я добра памятаю, як першы год мы малявалі з Дзежыцам. Ён не толькі тлумачыў асаблівасці жывапіснага працэсу, ён перш за ўсё вучыў нас бачыць. Гэта быў прыроджаны педагог, які аддаваў сябе гэтай справе цалкам..."[20]. "Гэты невысокага росту чалавек заўжды ўражваў нас энергічнасцю і тэмпераментам, – узгадвае С. Сянько. – Ён выкладаў у нас алейны жывапіс. У Дзежыца было нешта такое, што прыцягвала да яго навучэнцаў. Ён лёгка знаходзіў з імі агульную мову"[21].

Многія з выпускнікоў вучылішча называлі імя Дзежыца сярод педагогаў, якія паўплывалі на фарміраванне іх мастацкага светапогляду. "З вышыні сваіх сённяшніх гадоў я разумею, што Дзежыц вучыў нас не толькі канкрэтным прыёмам рэалістычнага жывапісу, паказваў, як і што трэба рабіць, але імкнуўся прывіць нам любоў да творчай працы, выхоўваў густ, – узгадваў свайго выкладчыка Г. Лебедзеў. – Мы паважалі яго за прафесіяналізм, за «фанатызм» у сваёй прафесіі..."[22].

Са жніўня 1949 года Дзежыц па сумяшчальніцтве працуе таксама ў Доме піянераў, што размяшчаўся ў двухпавярховым будынку па вуліцы Фрунзе. У студыю да яго хадзіў і Васіль Ціханенка, які адзначае: "Дзежыц – педагог вышэйшай катэгорыі. Ён вучыў нас маляваць акварэллю, ляпіць... Па сутнасці, ён адкрыў для нас новы свет, паказаў, што рабіць і як. Разам з ім мы нават ездзілі на веласіпедах у Падбярэззе на пленэр. А калі ўзімку пасля

[17] Віцебская абласная выстава (1946), Усебеларуская мастацкая выстава (1946), Выстава твораў мастакоў БССР (1947).
[18] З успамінаў выпускніка вучылішча 1955 г. А. Ільінова. Запіс гутаркі 1994 г.
[19] Запіс гутаркі з выпускніцай вучылішча 1954 г. А. Жукавай.
[20] З успамінаў выпускніка вучылішча 1955 г. М. Апіёка. Запіс гутаркі – люты 2024 г.
[21] З успамінаў выпускніка вучылішча 1960 г. С. Сянько. Запіс гутаркі – люты 2024 г.
[22] З успамінаў выпускніка вучылішча Г. Лебедзева. 1983 г.

заняткаў ішлі дадому ён звяртаў нашу ўвагу на прыроду вакол нас, на тое, як свеціць сонца, як блішчыць снег…”[23]. “Я таксама да арміі займаўся ў студыі, дзе вёў Дзежыц, – успамінаў А. Філіпаў. – Але з самім Дзежыцам я сустракаўся яшчэ ў даваенны час, калі мая маці А. Філіпава выкладала ў вучылішчы, а яе калегі – Хрусталёў, Ахрэмчык, Фогт, Дзежыц прыходзілі да нас дамоў. Мне запомнілася тады, што Дзежыц любіў пець рамансы...”[24].

Выкладаючы ў Віцебскім мастацка-графічным педагагічным вучылішчы, Дзежыц “творчай працай займаецца сістэматычна” – так адзначаецца ў яго характарыстыцы [2]. Невыпадкова ўжо ў 1946 годзе Дзежыца прымаюць у члены саюза мастакоў. Разам з тым ён жыў у невялікай кватэры і не меў нават майстэрні для працы[25]. У 1954 годзе мастак напіша: “Мая педагагічная дзейнасць адымае максімум часу і энергіі. Але стараюся не адарвацца ад творчай дзейнасці, наколькі гэта ў маіх сілах” [10].

Калега Р. Клікушын успамінаў: “Дзежыц да мозга касцей мастак. Чысцейшы, сумленны чалавек. Рабоце аддаваўся цалкам. (...) Мы часта разам удзельнічалі ў адных і тых жа выставах. Вазілі творы на пасяджэнні выстаўкама ў Мінск. Разам з Дзежыцам перажывалі, марылі і хваляваліся”[26].

Кампазіцыі мастака з адлюстраваннем працэсаў пасляваеннага аднаўлення горада адзначаны ўнутраным эмацыянальным уздымам. Але ў адлюстраванні працоўных працэсаў няма бравурнасці і ложнага пафасу, тут больш цеплыні і чалавечых пачуццяў (“Аднаўленне маста праз Віцьбу ў Віцебску ў 1944 г.” (1952). Той жа не паказны, але жыццесцвярджальны аптымізм мы бачым у фігуратыўных кампазіцыях “Каля ткацкага станка” (1952), “Дывановы цэх” (1954).

Тэма Віцебска і яго ваколіц стала вядучай у творчасці Дзежыца. Ён любіў свой горад і добра ведаў яго. “Віцебск мы з ім абышлі ўвесь, усе ваколіцы, – адзначала прыёмная дачка Дзежыца Вера. (...) Ведаў ён усе старыя, найбольш цікавыя будынкі горада, расказваў аб іх гісторыі” [15]. Мастак піша гарадскія матывы (“Паводка” (1956), “Паводка. Стары горад” (без даты), “Прыстань на Дзвіне” (1958), але не меншым натхненнем звяртаецца да лірычных пейзажаў ваколіц Віцебска (“Прасёлак Падбярэззе” (1953), “Восеньская раніца” (1955), “Веснавыя цені” (1956), “Раніца на Віцьбе” (1958), “На эцюдах (Падбярэззе)” (1958), “Вясна на Віцьбе” (1959), “Раніца” (1959).

1 верасня 1959 года ў Віцебскім дзяржаўным педагагічным інстытуце ствараецца мастацка-графічны факультэт, куды Дзежыц пераводзіцца на працу на пасаду старэйшага выкладчыка і адначасова выконваючага абавязкі загадчыка кафедры жывапісу і графікі [6].

У сваіх успамінах аб Віцебскім мастацка-графічным педвучылішчы і першых гадах дзейнасці мастацка-графічнага факультэта заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь І. Сталяроў пісаў: “Я пазнаёміўся з Дзежыцам яшчэ ў даваенны час, калі наведваў гарадскі гурток выяўленчага мастацтва, які ён вёў. Тут я ўпершыню сустрэўся з акварэллю і палюбіў яе на ўсё жыццё. Потым мне пашанцавала вучыцца два гады ў Дзежыца ў Віцебскай мастацкай вучэльні. Ну а пазней мы сустрэліся з ім зноў, ужо як калегі: я прыехаў у Віцебск пасля заканчэння ў 1948 годзе Мінскага мастацкага вучылішча. Пазней, як загадчык кафедры, ён прыслухоўваўся да маіх прапаноў і пажаданняў, якія былі звязаны са зменамі вучэбнай праграмы па алейным і акварэльным жывапісе. Дзежыц падтрымаў маю прапанову падзяліць акварэль і алейны жывапіс па курсах, пакінуў акварэль на першым і другім, а алей – на старэйшых курсах. І, нарэшце, была зацверджана і мая прапанова, якая дазваляла студэнтам, якія добра паспявалі, па іх жаданні працягваць займацца акварэльным жывапісам на наступных курсах і абараняць дыпломную працу ў гэтым матэрыяле”[27].

“Калі Дзежыц садзіўся кіраваць працай студэнта, – узгадваў В. Клімовіч, – не шкадаваў яе. І няшчасны навучань у думках казаў «бывай» сваёй пачатай карціне. Дзежыц рабіў з ёй усё што хацеў. І потым лёгка і элегантна выціраў пэндзаль пад мышкай свайго халата” [16]. І разам з тым “па характары Дзежыц быў незвычайна добры, мяккі і дабрадушны чалавек. Праглядаючы працы навучэнцаў заўсёды быў стрыманы і нібыта саромеўся сказаць сваё крытычнае меркаванне. Хоць па яго настроі было бачна, што слабыя дылетанцкія працы ў яго выклікалі вялікае расчараванне”[28].

У пачатку 1960-х многія рэспубліканскія перыядычныя выданні друкуюць матэрыялы, што апавядаюць аб справах на маладым факультэце. Паўсюдна аўтары артыкулаў пішуць аб плённай працы выкладчыкаў, іх творчай дзейнасці. Імя Дзежыца прыгадваецца адным з першых [17]. “Студэнты любяць яго за нястомнасць, за добры творчы запал. Яго стараннямі і клопатамі на факультэце арганізуюцца абменныя выстаўкі студэнцкіх работ з розных інстытутаў краіны” [18].

23 З інтэрв’ю з В.Я. Ціханенкам. Запіс 15.02.2024.
24 Запіс гутаркі з А. Філіпавым. 2013 г.
25 З інтэрв’ю з В.Я. Ціханенкам. Запіс 15.02.2024.
26 Запіс гутаркі з Р. Клікушыным. 1998 г.
27 З успамінаў І. Сталярова. Запіс гутаркі 2010 г.
28 Запіс гутаркі з выпускніцай вучылішча 1954 г. і МГФ ВДПІ 1963 г. А. Жукавай.

У лютым 1964 года Дзежыц быў прызначаны на пасаду дацэнта і загадчыка кафедры малюнка і жывапісу [19]. Рэктарат Віцебскага пединстытута ў 1962 годзе прадставіў Дзежыца да вучонага звання дацэнта. Народны мастак БССР В. Волкаў, які падтрымаў гэта хадатайніцтва, пісаў: “Стоячы цвёрда на пазіцыях сацыялістычнага рэалізму, ён стварыў цэлы шэраг каштоўных мастацкіх твораў, многія з якіх знаходзяцца ў музеях Мінска, Віцебска і інш.” [5].

Аднак “Дзежыцу давялося нялёгка: праграм інстытуцкіх не існавала, усё трэба было перарабляць па новым плане, арганізоўваць вучэбна-выхаваўчую работу, узмацняць (!) палітычную адукацыю студэнтаў. Партыйныя органы патрабавалі якасці выкладання не столькі па спецдысцыплінах, колькі па грамадска-палітычных. Мастакам гэта было не па сілах. Інстытуцкае кіраўніцтва заўжды ў рэзкай форме выказвала сваю незадаволенасць работай Дзежыца: «чысціла» яго на ўсіх сходах і вучоным савеце. А ўся бяда была ў тым, што Дзежыц не быў канцылярыстам ці адміністратарам, не пісаў ён ніякіх пратаколаў, не вёў журналаў па ўліку палітычна-выхаваўчай работы на кафедры. Таму ў камісіі складалася ўражанне, што на кафедры ўвогуле няма ніякай працы. Пасля чарговага пасяджэння вучонага савета Дзежыцу стала вельмі дрэнна, а потым яго паралізавала. Дзежыц, дабрэйшы, сумленны і сціплы чалавек, мастак Божаю ласкаю, не вытрымаў такога націску і ў канцы 1964 года мы яго пахавалі” [20].

Пейзажам Дзежыца 50-х – пачатку 60-х гадоў уласцівая непасрэднасць адлюстравання складаных і адначасова тонкіх пачуццяў. Параненйшаму на палотнах мастака сустракаюцца індустрыяльныя матывы (“Лес – Віцебску” (1961), “На дравяным складзе” (1961), “Лесапільны цэх” (1962), а таксама кампазіцыі з гарадскімі краявідамі (“Віцебск будуецца” (1961). У рэальна-канкрэтных матывах прыроды эмацыянальны фон звычайна паўстае аднοй з дамінантаў вобразнасці (“Сакавік” (1960), “Пралескі” (1960), “Вясна ў Віцебскай ТЭЦ” (1960), “Красавіцкі вечар” (1960). Нягледзячы на камернасць, у лірычным перажыванні прыроды ёсць тая прыўзнятасць, значнасць, якая выводзіць пейзажы за рамкі простых эцюдаў. Увогуле, у творчасці Дзежыца, які шмат працаваў непасрэдна на прыродзе, непазбежна сціралася мяжа паміж эцюдам і карцінай. У карцінах мастак захоўвае беглασць мазка, яго свабоду, фрагментарнасць кампазіцыі. А ў эцюдах – карцінную пабудову, і вобразную завершанасць матыву, які ён піша. Менавіта ў пленэры бярэ пачатак і цёплая сонечная гама, якая часта прысутнічае ў большасці краявідаў Дзежыца.

**Заключэнне.** Як у сваёй педагагічнай дзейнасці, так і ў творчасці В. Дзежыц аддаваў перавагу рэалістычным традыцыям. Пра гэта сведчаць і жывапісныя кампазіцыі мастака 1930-х – пачатку 1960-х гадоў. Дыяпазон творчых пошукаў Дзежыца ў жанры пейзажа даволі шырокі: ад лірычнага, камернага да архітэктурнага, гістарычнага і індустрыяльнага пейзажа, ад натурнага эцюда да пейзажа-карціны. Прыцягальнасць твораў Дзежыца гэтага перыяду ў шчырасці і аптымістычным характары вобразнасці і, безумоўна, у мастацкай выразнасці выканання.


**ЛІТАРАТУРА**

1. Лисов, А.Г. Шаги к послевоенному возрождению художественной школы: Витебское художественно-графическое педучилище и Валентин Дзежиц / А.Г. Лисов // Национальные традиции в современном искусстве и художественном образовании: материалы междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 24–26 сент. 2019 г. / Витеб. гос. ун-т; редкол.: Ю.П. Беженарь (отв. ред.) [и др.]. – Витебск, 2019. – С. 231–236.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей ДАВВ). – Ф. 408. Воп. 1. Спр. 8. Арк. 1, 2.
3. Исаков, Г.П. Художник и педагог Валентин Константинович Дзежиц / Г.П. Исаков // Изобразительное, декоративно-прикладное искусство и дизайн в системе художественного образования: материалы VII Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 24 нояб. 2010 г. / Витеб. гос. ун-т; под ред. Д.С. Сенько. – Витебск: УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2011. – С. 113–118.
4. Долматов, С.Х. Художник-педагог В.К. Дзежиц / С.Х. Долматов // Методика развития творческих способностей на занятиях по рисунку, живописи и композиции: межвуз. сб. науч. тр. – М.: Изд-во «Прометей» МГПИ им. В.И. Ленина, 1989. – С. 59–68.
5. ДАВВ. – Ф. 408. Воп. 1. Спр. 11. Арк. 1.
6. ДАВВ. – Ф. 408. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 6.
7. Адаскина, Н.Л. Педагогическая система К.С. Петрова-Водкина / Н.Л. Адаскина // Очерки по русскому и советскому искусству. Статьи. Публикации. Хроника: сб. науч. тр. / Государственная Третьяковская галерея; ред. И.М. Гофман; общ. ред. Т.М. Коваленская. – Л.: Художник РСФСР, 1974.
8. Рылов, А. Воспоминания / А. Рылов. – Л.: Художник РСФСР, 1977. – С. 206.
9. Боровский, А. Круг Петрова-Водкина / А. Боровский // Круг Петрова-Водкина: альманах. – СПб.: Palace Editions, 2015. – Вып. 466. – С. 10.
10. ДАВВ. – Ф. 408. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 1, 2.
11. Богдан, В. Академия художеств. 1920-е – начало 1930-х / В. Богдан // Третьяковская галерея. – 2013. – № 2. – С. 62–77.
12. Даркевіч, П. Рост пралетарскага мастацтва БССР / П. Даркевіч // Віцебскі пралетарый. – 1934. – 27 мая. – С. 3.
13. Морозов, А.И. Конец утопии: из истории искусства в СССР 1930-х годов / А.И. Морозов. – М.: Галарт, 1995. – С. 189.
14. Виноградов, В.Н. Витебское художественно-графическое педагогическое училище / В.Н. Виноградов, Е.Т. Жукова. – Витебск: ВГУ им. П.М. Машерова, 2005. – 48 с.
15. ДАВВ. – Ф. 408. Воп. 1. Спр. 31. Арк. 5.
16. Колодовский, И.И. Педагогическое и творческое наследие Д.П. Генеральницкого / И.И. Колодовский // Искусство и культура. – 2019. – № 3. – С. 39–47.
17. Вінаградаў, В.Н. Гісторыя мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава на старонках друку // Искусство и культура. – 2018. – № 2(30). – С. 89–94.
18. Доктараў, Ю. Мастак-педагог / Ю. Доктараў // Віцебскі рабочы. – 1964. – 19 ліп. – С. 3.
19. ДАВВ. – Ф. 408. Воп. 1. Спр. 16. Арк. 13.
20. Клікушын, Р. «Мяне адлучылі ад віцебскай мастацкай школы...» / Р. Клікушын; апрац. тэксту і пер. М. Цыбульскі // Вечерний Витебск. – 1996. – 6 дек. – С. 3.


*Паступіў у рэдакцыю 20.02.2024*